# КНЯЗІ ВКЛ XIII-XIV СТСТ. ІХ УПЛЫЎ НА ФАРМІРАВАННЕ ДЗЯРЖАВЫ

*Багінскі Д.С., Кудзеліч К.С.*

*Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Куракевіч Н.І. – канд. гіст. навук*

ВКЛ – адна з магутных дзяржаў перыяду XIII-XIV стст. Гэта было дасягнута дзякуючы вялікім князям, пра якіх будзе ісці размова ў дадзеным дакладзе.

Міндоўг (1248–1263) — першы гаспадар Вялікага Княства Літоўскага. З крыніцы Лівонскай рыфмаванай хронікі нам вядома, што ён паходзіў з балцкай каралеўскай сям'і. Ён быў добрым воінам і ўдалым палітыкам. Узмацняць сваю ўладу ў Наваградку ён пачаў, калі ўступіў у саюз з мясцовай уладай і багацеямі, якія звярнулі на яго ўвагу праз яго палітычныя і ваярскія здольнасці. Потым ён і сам стане правіць у Наваградку, які стане першай сталіцай новай дзяржавы. Міндоўг будзе кіраваць 15 гадоў, за якія пакажа сябе, як ўдалы смелы ваяр і рашучы палітык. Разам з двума сынамі быў забіты змоўшчыкамі разам з Транятам у 1263 годзе.

Войшалк (1264–1267) – старэйшы сын Міндоўга, вялікі князь літоўскі і праваслаўны манах (заснавальнік Лаўрышскага манастыра, 1257). У летапісах пра яго пішуць, як пра вельмі жорсткага чалавека, які і дня не мог правесці без забойства каго-небудзь. Але пасля прыняцця хрысціянства ён змяніўся. Пасля мірных перамоў у 1254 з Галіцка-Валынскімі князямі ён аддаў у валоданне свае Панямонні. Войшалк прыняў пострыг і стаў манахам. Аднак ў 1258 ён вярнуўся з манаства, каб даць адпор татарам, галічанам і валынянам. І другі раз у 1263, пасля забойства бацькі, каб даць адпор Траняту (жамойцкі князь), што захапіў трон. Але з падтрымкай Пінскай і Наваградскай дружыны Войшалк стаў вялікім князем разам з Шварнам (муж сястры, сын Галіцка-Валынскага караля). У 1264 годзе заваяваў Дзяволтву і Нальшчаны. Калі у 1267 годзе сітуацыя ўнутры краіны стабілізавалася і мір з суседзямі быў заключаны, ён зноў вярнуўся ў манастыр. Быў забіты змоўшчыкамі у 1267 ў горадзе Уладзімір–Валынске.

Трайдэн (1269–1282) – вялікі князь літоўскі. З Лівонскай старэйшай рыфмаванай хронікі гісторыкі робяць выснову, што ён паходзіў з Кернава. У час свайго кіравання ён наладжваў саюзныя адносіны са слабейшымі суседнімі краінамі і паспяхова ваяваў з Тэўтонскім ордэнам і Галіцка-Валынскім княствам. Ён удала выкарыстоўваў унутраныя канфлікты суседзяў: у Прусіі падтрымліваў мясцовыя плямёны ў барацьбе з Тэўтонскім ордэнам, сябраваў з аднымі Галіцка-Валынскімі князямі і ваяваў з іншымі. Вывеў княства Літоўскае з-пад залежнасці Галіцка-Валынскага. Пры ім былі далучаны землі амаль усёй Чорнай Русі, таксама ў 1279 ён заключыў мір з полацкім князем Баляславам.

Віцень (1293–1316) – старэйшы брат Гедыміна, заснавальніка дынастыі Гедымінавічаў. У час свайго кіравання вёў войны з Тэўтонскім ордэнам і жмудзінамі, каб захаваць цэласнасць ВКЛ. Так у 1298 годзе наладзіў саюз з горадам Рыгай і заручыўся іх падтрымкай, у бітве на рацэ Трэйдары-Аа (зараз Гаўя) разбіў войска Лівонскага Ордэна. Першы сярод літоўскіх князёў пачаў далучаць землі мірным шляхам. Так быў далучаны Полацк. Пры ім былі адваёваны Галіцка-Валынскае княства і далучаны землі Брэста, Падляшша, частка паўночнай Смаленшчыны: Ржэўская і Таропіцкая воласці. На землях, далучаных пры ім, знаходзіліся рэкі, якія звязвалі Ноўгарад і Еўропу, што ў час Сярэднявечча былі асноўнымі камунікацыйнымі сродкамі. Зрабіў для сябе і ўсяго княства Літоўскага герб «Пагоня».

Гедымін (1316–1341) – брат Віценя. Да станаўлення князём самога ВКЛ ён быў намеснікам Віценя ў Аўкштайціі. Галоўнай справай для Літвы таго часу была вайна з Орданам, які нападаў нечакана і мог прынесці шкоду для ўсіх слаёў насельніцтва. Ён пачынае будаўніцтва каменных замкаў па лініі Трокі, Вільна, Медннякі, Гродна, Наваградак, Ліда, Крэва, Мядзель. Таксама адным з яго метадаў кіравання былі дыпламатычныя адносіны. Ён жаніў сваіх дзяцей з княжнамі і князямі другіх княстваў, падтрымліваў тых, хто таксама ваяваў з Орданам. Ад канца 1322 года Гедымін пачаў праводзіць кампанію, мэтай якой было спыненне стану вайны з Тэўтонскім ордэнам. Паколькі мірным шляхам гэта зрабіць не атрымалася, ён пачаў наладжваць дыпламатычныя адносіны з Захадам. Гедымін перанёс сталіцу ў Вільна у 1323 годзе і пачаў праводзіць перапіску з важнымі дзеячамі таго часу: папам Рымскім, кіраўнікамі Еўрапейскіх краін, дзе ён гаварыў аб набегах крыжакоў на каталіцкія касцёлы. У жніўні 1323 года ў Вільню прыбыло пасольства ад рыжскага архіепіскапа і магістрата, дацкага кіраўніцтва і прадстаўнікоў Лівонскага ордэна. Мірны дагавор з Лівонскім Ордэнам хоць і быў заключаны, але гэта нічога не прынесла краіне.

У канцы кіравання Гедыміна да тэрыторыі ВКЛ будуць далучаны амаль усе землі сучаснай Беларусі, Галіцка-Валынскае княства. Ён пакінуў пасля сябе моцную дзяржаву, з якой лічыліся Польскае каралеўства, Лівонскі Ордэн, Пскоўская і Наўгародская Рэспублікі.

Альгерд і Кейстут (1345– 1377) – браты-суправіцелі. Сярэднія сыны Гедыміна. Альгерд - быўшы Крэўскі князь, Кейстут - быўшы князь Торкскага княства. Пасля таго, як бацька пакінуў на троне свайго малодшага сына Еўнута, яны звярглі яго з пасады (пасля няўдалай вайны) і пачалі княжыць самі. Альгерд адказваў за ўсходнія землі і насіў тытул Вялікага князя, а Кейстут кіраваў заходнімі землямі.

Альгерда апісваюць, як добрага палітычнага дзеяча, таленавітага палкаводца, таксама ён меў моцную падтрымку народа. У 1348 годзе яго войска, на р. Сінія Воды перамагло трох мангола-татарскіх ханаў, у выніку чаго былі далучаны тэрыторыі Кіеўшчыны і Падолля. У выніку трох паходаў на Маскву (1368, 1670, 1372) былі далучаны часткі тэрыторый Смаленскіх, Брянскіх зямель і тэрыторыя Чарнігава-Северскага княства.

Кейстут увайшоў у гісторыю, як герой вайны з крыжакамі, абаронца зямлі ад ордэнскіх нападаў. У тыя жорсткія часы ён паказваў сябе, як прыклад гуманасці: ён ратаваў ад смерці падрыхтаваных да пакарання воінаў і прыказваў хаваць загінуўшых крыжакоў.

У 1348 войска Кейстута разбіла ў баі на р. Страве крыжакоў. А ў 1362-1363 яму ўдалося далучыць да Вялікага Княства Літоўскага Падолле, прагнаўшы адтуль дробных татарскіх ханаў. Пасля смерці Альгерда ў 1377 пачнецца барацьба за ўладу паміж яго сынам Ягайлам, яго братамі і Кейстутам. Аднак у 1392 годзе Вялікім князем стане Вітаўт, пры якім ВКЛ стане самай магутнай дзяржавай у Еўропе і дасягне найбольшага росквіту.




На працягу існавання ВКЛ у перыяд з 13 па 14 ст.ст. у краіне змянілася мноства князёў. У іх адрозніваліся метады кіравання, галоўныя ворагі і цяжкасці ў кіраўніцтве. Аднак разам яны зрабілі магутную краіну, якая стала найбуйнейшай у Еўропе, з якой лічыліся суседзі і баяліся ворагі.

***Спіс выкарастаных крыніц:***

*1. Великие князья Великого Княжества Литовского, Виктор (Витовт) Кузьмич Чаропко*
*2. http://history-belarus.com/pages/figures/mindowg.php*
*3. http://www.spsl.nsc.ru/history/descr/litv.htm*
*4. https://bis.nlb.by/ru/documents/138577*